*Валынец, А. А.* Капітулярый *Divisio imperii* і прынцыпы спадчыннасці трона ў імперыі франкаў / А. А. Валынец // Лістападаўскія сустрэчы – 5. Праблемы старажытнасці і сярэднявечча: Зборнік артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава (13–14 лістапада 2003 г., Мінск) / Навук. рэд. В. А. Фядосік і І. А. Еўтухоў. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 131-133.

***А. А. Валынец***

# КАПІТУЛЯРЫЙ *DIVISIO IMPERII* І ПРЫНЦЫПЫ СПАДЧЫННАСЦІ ТРОНА Ў ІМПЕРЫІ ФРАНКАЎ

814 г. памёр імператар франкаў Карл Вялікі. Ён не пакінуў пасля сябе дакумента, які б дакладна вызначыў прынцып перадачы па спадчыне імператарскага прастола. У 806 г. Карл спрабаваў размеркаваць уладу і тэрыторыю дзяржавы паміж сваімі сынамі Карлам, Піпінам і Людовікам (капітулярый Ordinatio imperii). Але абставіны склаліся так, што ў жывых застаўся толькі Людовік (будучы Людовік Набожны). У сувязі з гэтым на некаторы час адпала неабходнасць выдання якога-небудзь спецыяльнага заканадаўчага акта. У 813 г. Людовік атрымаў імператарскую карону аўтаматычна.

Але ў хуткім часе ўжо Людовік Набожны сутыкнуўся з неабходнасцю ўрэгуляваць адкладзенае пытанне. Праблема ўключала ў сябе тры галоўныя аспекты: 1) неабходна было захаваць імперыю ў межах 814 г. пад адным скіпетрам, 2) трэба было пры гэтым падзяліць дзяржаву ў адпаведнасці са старажытнымі традыцыямі народа франкаў паміж сынамі імператара Лотарам, Піпінам і Людовікам, 3) неабходна было ажыццявіць эфектыўны падзел уладавых паўнамоцтваў паміж гэтымі асобамі.

У 817 г. Людовік Набожны на ахенскім сейме выдаў капітулярый Divisio imperii. Гэты дакумент ліквідаваў супярэчнасць пміж першым і другім аспектамі пазначанага пытання. Капітулярый дакладна акрэсліваў механізм перадачы трона па спадчыне з улікам старажытнай традыцыі выбарнасці манарха. Згодна з арт. 14 перавага аддавалася старэйшаму сыну.

Імператар назваў свайго першароднага сына Лотара сукіраўнікам імперыі. Лотар прайшоў праз працэдуру зацвярджэння імператарскага статуса ўдзельнікамі сейма: «...жаданні нашы і ўсяго пашага народа супалі. Такім чынам, згодна з выяўленнем боскага наканавання нам і ўсяму нашаму народу пажадана, каб ён быў каранаваны імператарскай каронай па ўрачыстым звычаі ў якасці нашага сукіраўніка ў імперыі, калі гэта дазваляе Бог і атрымана агульная згода». Людовік перадаў Лотару ўсю імперыю франкаў. Тытулы каралёў былі названы менш значнымі, а іх носьбіты абмяжоўваліся ў правах адносна імператара ў асобе старэйшага брата. Згодна з арт. 14 новы падзел імперыі не прадугледжваўся. У выпадку,



калі адзін з каралёў паміраў без законных нашчадкаў, яго каралеўства да выбрання новага караля пераходзіла пад кіраванне імператара.

За малодшымі сынамі Людовіка Набожнага пацвярджаўся каралеўскі тытул. Яны атрымалі надзелы для задавальнення сваіх жыццёвых патрэб. Піпін атрымаў Аквітанію, каралём якой раней быў сам Людовік Набожны, а таксама Васконію (Гасконь), Тулузскую марку, графствы Каркасонскае, Аўгустадунскае, Аваленскае і Нівернэ. Людовік Нямецкі атрымаў Баварыю, Карынтыю, Багемію, землі, населеныя палабскімі славянамі і аварамі, а таксама вілы Інгальштад і Лютраўф. Лотар

кантраляваў усю астатнюю тэрыторыю імперыі, у тым ліку каралеўства Італія, якую адняў у Бернарда, пазашлюбнага сына Піпіна Італіянскага, пляменніка Людовіка Набожнага. Кожны з трох сыноў імператара меў права карыстацца даходамі з прызначанай яму тэрыторыі.

Самым складаным пытаннем стаў падзел уладавых паўнамоцтваў. З 817 г. у дзяржаве стала два імператары, старшы і малодшы. Людовік Набожны дэклараваў падпарадкаванне малодшага імператара старшаму. Улада старшага імператара над малодшым была тоесная ўладзе бацькі над сынам. Гэта бачна з прэамбулы: «...згодна з нашай імператарскай уладай над сынамі і нашым народам, з дапамогай усіх падданых кароль і імператар павінныя падтрымлівацца сваімі народамі як бацькі сынамі».

Старшы брат атрымліваў перад малодшымі вялікую перавагу. Магчыма меркавалася, што тытул імператара далей будзе пераходзіць да старэйшага сына папярэдняга манарха. Старэйшы брат меў права штогод атрымліваць ад малодшых падарункі і справаздачу. У выпадку неабходнасці малодшыя браты павінны былі аддаваць старэйшаму вайсковую дапамогу. Старэйшы брат кантраляваў шлюбныя партыі малодшых. У выпадку непаўналецця нашчадка таго ці іншага каралеўства рэгентам станавіўся старэйшы брат яго бацькі.

Лёс адыграў з Людовікам Набожным злы жарт. У 818 г. памёрла яго жонка Эрменгарда, у 819 г. ён ажаніўся з маладой прыгажуняй Юдзіф'ю, а ў 823 г. нарадзіўся Карл Лысы. Людовік пажадаў змяніць умовы Divisio imperii, каб выдзеліць частку дзяржавы малодшаму сыну. Аднак старэйшыя сыны выступілі супраць змянення капітулярыя, які іх цалкам задавальняў. Такая супярэчнасць прывяла да вайны, якая доўжылася з перапынкамі ад 830 да 842 г. і закончылася вердэнскім падзелам 843 г.



Такім чынам, можна зрабіць наступныя высновы:

- Divisio imperii спрыяў захаванню адзінства імперыі франкаў у межах 814 г., а яго парушэнне стала адной з прычын распаду дзяржавы Карла Вялікага.
- Дакумент уводзіў на практыцы прынцып маярату.
- Ён акрэсліваў васальныя абавязкі караля перад імператарам.
- Капітулярый пераносіў сямейныя адносіны ў родзе Каралінгаў на дзяржаўны ўзровень.